Дзяржаўная установа культуры
Цэнтаралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна
Філіял № 9

# “Мой незвычайны горад, дзе я была такою шчаслівай…”
## Гарадзенскія матывы ў жыццёвым і творчым шляху Вольгі Іпатавай

### Бібліяграфічны спіс






Гродна 2015

**«Мой незвычайны горад, дзе я была такою шчаслівай…»: гарадзенскія матывы ў жыццёвым і творчым шляху Вольгі Іпатавай: да 70-годдзя з дня нараджэння : бібліяграфічны спіс / Дзяржаўная установа культуры «Цэнтаралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»; філіял №9; уклад. Аўдзяевіч В.У. – Гродна, 2015. – 9 с.**

В.М. Іпатава каля дзесяці гадоў пражыла ў Гродне, дзе адбылося станаўленне яе асобы і пачатак творчасці.

Прапануем вашай увазе спіс друкаваных матэрыялаў аб жыцці і творчасці пісьменніцы ў гродзенскі перыяд.





***Вольга Міхайлаўна Іпатава (нар. 01.01.1945)***

Шчаслівая наканаванасць лёсу Вольгі Іпатавай – нарадзіцца, расці, духоўна сталець сярод гістарычных мясцін Беларусі – Міра, Навагрудка, Гродна, з іх велічнымі старажытнымі замкамі, якія дыхалі нязведанай даўніной і незвычайнай таямнічасцю.

Вольга Міхайлаўна Іпатава нарадзілася 1 студзеня 1945 года ў старажытным мястэчку Мір. Пачатак яе жыццёвага шляху быў не вельмі спрыяльным. Дзяцінства было азмрочана асабістай трагедыяй – у чатырохгадовым узросце яна страціла маці. Маленькую Вольгу выхоўвала бабуля. Мудрая жанчына ахінула асірацелае дзіця шчырай любоўю і клопатам. Але праз некалькі гадоў дзяўчынцы давялося пакінуць утульны бабулін дом і, вярнуўшыся ў новую бацькаву сям'ю, адчуць халоднае і абыякавае стаўленне мачахі. Уражлівае дзіця не здолела прызвычаіцца да жорсткасці чужога чалавека і аддало перавагу суровым парадкам дзіцячага дома. Знаёмыя паспрыялі ўладкаванню дзяўчынкі ў Гродзенскі дзіцячы дом. Але і тут жыццё наладзілася не адразу. Вольга вельмі адрознівалася ад дзяцей свайго ўзросту: асноўным яе

захапленнем былі кнігі, яна чытала запоем і пасля пяці класаў дэкламавала на памяць «Рамэа і Джульету», ведала творы Драйзера і Петраркі, спрабавала сама пісаць. «Аднойчы …знайшлі ў мяне пад падушкай вершы. Гэта былі мае сатыры на некаторых з іх (дзяцей), напісаныя, калі на сэрцы было балюча і горка. Мне давялося ваяваць за свае вершы ў прамым фізічным сэнсе. Але я іх адстаяла. І сваё права пісаць так, як я хачу і пра каго хачу», – успамінала Вольга Міхайлаўна шмат гадоў пасля.

Дзяўчынка рана адчула самастойнасць, навучылася разумець і пераадольваць цяжкасці, у гэтых умовах і выкоўваўся характар, сіла волі. У Гродне ёй пашчасціла сустрэць сапраўдных духоўных настаўнікаў, калі на вершы, якія дзяўчына пачала пісаць з адзінаццаці гадоў, звярнулі ўвагу Аляксей Карпюк, Міхась Васілёк і Васіль Быкаў. Першы верш Вольгі Іпатавай быў надрукаваны ў газеце «Зорька». Для дзяўчыны гэта была радасць і гонар, адчуванне сваёй значнасці. З таго часу вершы маладой паэтэсы пачалі пастаянна друкавацца ў «Гродзенскай праўдзе», пазней у часопісах «Бярозка», «Маладосць», «Беларусь» і іншых выданнях. На свае першыя невялікія ганарары Вольга купляла цукеркі для ўсей дзетдомаўскай групы. Гэтыя гады пражывання ў Гродзенскім дзіцячым доме і вучобы ў сярэдняй школе №7 (1956-1961) згадваюцца з вышыні пражытага са светлаю тугою: там было шмат сяброў, там нараджаліся радкі юнацкіх вершаў. Гэта і час удзелу паэтэсы ў літаратурным аб’яднанні пры Доме афіцэраў, на паседжанні якога, па ўспамінах пісьменніцы,

«прыходзілі літкансультант «Гродзенскай праўды» Васіль Быкаў, салдаты Хведар Чэрня і Пятро Сушко». Але самымі вялікімі святамі былі паездкі і літаратурныя выступленні, якія ладзіў сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Аляксей Карпюк. Выступаць Вольга не надта любіла, але гатовая была бясконца слухаць, як чытае свае вершы Данута Бічэль-Загнетава, як хораша, з гумарам расказвае свае гісторыі Карпюк, як сціпла гаворыць пра герояў сваіх аповесцей Васіль Быкаў.

Скончыўшы школу ў шаснаццаць гадоў, Вольга Іпатава, выдатна вытрымаўшы ўступныя іспыты, паступае на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1961 год). «Са свайго дзяцінства я вынесла, акрамя трагічных момантаў, заўсёднае адчуванне чалавечнай дабрыні навокал», – з ўдзячнасцю ўспамінае пісьменніца.

На дзённым факультэце Вольга правучылася толькі два гады: жыць на адну стыпендыю было вельмі цяжка. Яна пераходзіць на завочную форму навучання і ўладкоўваецца на працу. Універсітэт скончыла ў 1967 годзе і дыплом абараняла на беларускім аддзяленні па творчасці Міхася Васілька.

У 1965 годзе Аляксей Карпюк дапамог дзяўчыне вярнуцца ў Гродна, горад дзяцінства. Па прызнанню Вольгі Іпатавай, пачалася «вялікая паласа майго жыцця: першая кватэра, шлюб, нараджэнне сына»… І новае месца працы – інструктар гаркама камсамола (1965-1968).

У снежні 1968 года ўпершыню загаварыла Гродзенская студыя тэлебачання. Вольга Іпатава – адна з першых рэдактараў тэлевізійнага вяшчання на Гродзеншчыне (1968-1972). Галоўнай заслугай Іпатавай на гэтай пасадзе было тое, што яна першая стала рабіць перадачы пра вялікіх беларускіх дзеячаў, імёны якіх калі і не забараняліся, то замоўчваліся ў савецкія часы.

У 1969 годзе выйшаў першы зборнік вершаў Вольгі Іпатавай з сімвалічнай назвай «Раніца». З удзячнасцю згадвае маладая паэтэса Аляксея Карпюка, які «стаў хросным бацькам» кнігі: «Рукапіс гэтай кніжкі Карпюк сам павёз у выдавецтва і паказаў Пятрусю Броўку. Броўка прыслаў мне ліст з прапановай дапоўніць кніжку вершамі, бо іх і сапраўды было малавата. Пасля працы я хадзіла між замкамі – Старым і Новым, – і радкі самі сабой нараджаліся – пра вуліцу Замкавую, пра Каложу»… Падрэдагаваць некаторыя вершы дапамагла Данута Бічэль-Загнетава на правах больш вопытнай паэтэсы. Кніга мела шчаслівы лёс, было шмат водгукаў: дзесяць рэцэнзій надрукавана ў рэспубліканскім і абласным друку. Таленавіты крытык Варлен Бечык адгукнуўся лістом-рэцэнзіяй. Ён пісаў: «…побач кніжка, дзе гаворыць душа з душою, дзе многія радкі ідуць ад сэрца, як свежае паветра ў нахлашч расчыненыя дзверы... »

У 1970 годзе Вольгу Іпатаву прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Рэкамендацыю далі Васіль Быкаў, Данута Бічэль-Загнетава, Аляксей Карпюк.

У Гродне пісьменніцай была створана першая ў беларускай літаратуры аповесць пра Еўфрасінню Полацкую. Пазней Вольга Міхайлаўна ўспамінала:

«Калі упершыню, у «Маладосці» (1971, №12) была надрукавана аповесць «Прадслава», пасыпаліся разгромныя рэцензіі». Аднак і ў той час былі станоўчыя водгукі, рэцэнзенты ўбачылі ў асобе Вольгі Іпатавай гісторыка, якому падуладны дакладнасць і праўдзівасць у апісанні жыцця таго часу.

У 1973 годзе Вольгу Іпатаву як лепшага рэдактара Гроденскай тэлестудыі запрасілі ў Мінск на працу ў рэдакцыю сталічнага тэлевяшчання. Пачалася новая паласа жыцця таленавітай пісьменніцы. Але сувязь з горадам дзяцінства працягвалася. У кнігах вершаў паэтка часта звяртаецца да вобразаў Гродзеншчыны, гучыць матыў вяртання да Нёмана, узнікаюць постаці гарадзенскіх творцаў.

У 1977 годзе выходзіць з друку першая кніга прозы Вольгі Іпатавай «Вецер над стромай». Лёгка ўгадваецца месца і час дзеяння ў аповесці – Гродна, 70-я гады, бо хто пабываў у нашым горадзе, які паэтызавала ў вершах і прозе Вольга Іпатава, не мог не пастаяць над нёманскай стромай каля двух каралеўскіх старажытных замкаў. Застаецца толькі дадаць, што прадмову для зборніка прозы «Вецер над стромай» напісаў Васіль Быкаў, які адзначыў: «Проза Вольгі Іпатавай – тварэнне прыроджанага празаіка, хоць шлях да яе ляжаў праз юнацкае захапленне паэзіяй».

Аўтабіяграфічнымі момантамі пазначана і выдатная аповесць Вольгі Іпатавай «Вузялок Святагора». Тэма аповесці (напісана на пачатку 80-х) – жыццё дзетдомаўцаў. У галоўнай гераіне Віне лёгка пазнаць саму Вольгу Іпатаву – таленавітую, чулую, надзвычай ранімую дзяўчыну. Праз успрыманне Віні

пісьменніца знаёміць чытыча з тым домам, дзе некалі ёй давялося жыць, сталець, зведаць горкія і радасныя хвіліны.

Згадаем словы Васіля Быкава: «Славу гораду, як і зямлі, робяць славутыя людзі». Мы ганарымся, што менавіта ў нашым горадзе пачала свой творчы шлях Вольга Міхайлаўна Іпатава, якая назаўжды застанецца ў літаратурнай гісторыі Гродна.

## Творы В.М. Іпатавай










1. Іпатава, В.М. Паміж Масквой і Варшавай (Некалькі гістарычных маршрутаў Беларусі) / В.М. Іпатава; перакл. на ням. Ф. Бубнера; маст. Л. Варэца, В. Варэца, А.П. Бажэнаў, Л.І. Мялоў. – Мінск : Полымя ; Бялун, 1996. – 212 с. : іл.
2. Іпатава, В.М. Парасткі : лірыка / В.М. Іпатава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. – 96 с.
3. Іпатава, В.М. Прадслава : аповесць / В.М. Іпатава // Бацькаўшчына : зб. гіст. літ.: для сярэд. і ст. шк. узросту / Іпатава В.М.; уклад., прад. С.С. Панізніка; маст. В.Р. Вярцейка. – Мінск : Юнацтва, 1998. – С. 77-133.
4. Іпатава, В.М. Перакат : апавяданні / В.М. Іпатава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 248 с.

5. Іпатава, В.М. Раніца : вершы / В.М. Іпатава. – Мінск : Беларусь, 1969. – 80 с.
6. Ипатова, О.М. Ветер над кручей : рассказы и повесть / О.М. Ипатова; предисл. В. Быкова. – Москва : Молодая гвардия, 1980. – 239 с.
7. Ипатова, О.М. Узелок Святогора : повесть и рассказы : пер. с бел. / О.М. Ипатова; послесл. Н. Пашкевича. – Москва : Молодая гвардия, 1986. – 239 с.
8. Іпатава, В. Успаміны пра Аляксея Карпюка / В.М. Іпатава // Карпюк А. Выбраныя творы / Аляксей Карпюк; уклад., прадм., камент. А. Фядута. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – С. 551-560.

## Пра жыццё і творчасць В.М. Іпатавай

### Кнігі

9. Бачыла, А. Чыстыя расінкі пачуцця / А. Бачыла // Бачыла, А. Крыло неспакою: пошук, роздум, палеміка, успаміны / А. Бачыла. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – С. 190-196. – Рэц. на кн.: Іпатава, В. Раніца : вершы / В. Іпатава. – Мінск : Беларусь, 1969.
10. Бечык, В. Набыццё вышыні / В. Бечык // Бечык, В. Выбранае: літ.-крытыч. артыкулы / В. Бечык; уклад. Л. Кароткая; прадм. С. Андраюка. – Мінск : Мастацкая літаратура,1989. – С. 424.
11. Быкаў, В. Вольга Іпатава : [прадмова да кнігі Вольгі Іпатавай «Вецер над стромай»] / В. Быкаў // Быкаў, В. Праўдай адзінай: літ. крытыка, публіцыстыка, інтэрв’ю / Васіль Быкаў; бібліягр. паказ. А.В. Карасёвай. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – С. 178-179.
12. Іпатава Вольга // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т.4, кн. 3 / НАН Беларусі, Адз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літаратуры; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – С. 643-660.

13. Іпатава Вольга Міхайлаўна // Максім Багдановіч : энцыклапедыя / склад. І.У. Саламевіч, М.В. Трус; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – С. 252.

14. Петрушкевіч, А.М. Гарадзенскія вобразы ў паэзіі Вольгі Іпатавай / А.М. Петрушкевіч // Новы замак : літ. альманах : Гродна. MMXII / укл. С. Астравец. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – С. 185-190.

15. Пяткевіч, А. Іпатава Вольга Міхайлаўна / А. Пяткевіч // Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны : даведнік / А. Пяткевіч. – Гродна : ГрДУ, 2000. – С. 118-119.

16. Пяткевіч, А. З пакалдення шасцідзесятых: [у т.л. пра В.М. Іпатаву] / А. Пяткевыіч // Пяткевіч, А. Літаратурная Гродзеншчына : публіцыстыка / А. Пяткевіч. – Мінск : ВыдЦэнтр Бацькаўшчына, 1996. – С. 54.

17. Савік, Л. Адна між замкаў : літ. партрэт В. Іпатавай / Л. Савік. – Мінск : БелСаЭС Чарнобыль, 2003. – 168 с.

18. Шупенька, Г. Кожная сустрэча – быццам першая / Г. Шупенька // Шупенька, Г. Прага мастацкасці: выбранае / Г. Шупенька. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – С. 414-418.

## Артыкулы

19. Кошур, С. Пісьменніца са старажытнага Міра / С. Кошур // Краязнаўчая газета. – 2010. – №14. – С. 4.

20. Мацюкевіч, М. Пуцяводная зорка беларусаў : вусны часопіс, прысвечаны Еўфрасінні Полацкай : [пра аповесць В. Іпатавай «Прадыслава»] / М. Мацюкевіч // Роднае слова. – 2001. – С. 61-64.

21. Савік, Л. «Беларусь! Твая дачка я…»: [пра жыццёвы і творчы шлях Вольгі Іпатавай] / Л. Савік // Полымя. – 1995. – №3. – С. 222-234.

Укладальнік: Аўдзяевіч В.У.
Рэдактар: Ілюшына І.М.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.

# «Мой незвычайны горад, дзе я была такою шчаслівай…»

## Гарадзенскія матывы ў жыццёвым і творчым шляху Вольгі Іпатавай

### Бібліяграфічны спіс

### 2015

На беларускай і рускай мовах


Укладальнік: Аўдзяевіч В.У.
Рэдактар: Ілюшына І.М.
Камп'ютэрная вёрстка: Аўдзяевіч В.У.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.